Цана асобнага нумару 20 гр. Przesyłka opłacona ryczałtem

№ 3 Вільня, Нядзеля 19 Студзеня 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—6 зл. на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	Цана абвестак: на 1-шай староны 60 гр., 2 і 3 — 50 гр.. на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

Сабор Праваслаўнай Царквы ў Польшчы.

З вялікім здаваленьнем спаткалі мы вестку аб тым, што нібы ўжо скора зьдзейсьніцца даўно чаканы Сабор Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Больш дзесяцёх гадоў Праваслаўная Царква ў Польшчы жыве сваім асобным, фактычна незалежным жыцьцём; пяць гадоў прайшло, як гэтая незалежнасьць (аўтокефалія) абʼяўлена афіцыяльна, а дагэтуль яшчэ ня было ў ей ніводнага сабору,— таго, што зьяўляецца падставай нармальнага жыцьця кожнай паменнай (аддзельнай, незалежнай) Царквы. За гэтыя часы набралася шмат кананічных і юрыдычных балючых спраў у царкоўным жыцьці, — за гэты час „уконстытуовэліся" (здабылі праўнае палажэньне) ў Польшчы ўсе іншыя рэлігійныя групы, ня толькі хрысьціянскія, але нават і нехрысьціянскія, а Праваслаўная Царква дасюль жыве ў Польшчы на грунце толькі нейкіх „тымчасовых пшэпісаў", ня толькі спрэчных з Конституцыяй, але нават і з некатарымі яшчэ не адмененымі былымі законамі расейскімі. Паўстала нейкая неакрэсьленасьць і блытаніна, а адсюль не далёка да розных надужыцьцяў, на якія так часта і не безгрунтоўна жаліцца праваслаўная ерархія і народ.

Дык як-жа не спаткаць з радасьцю вестку аб саборы? Сабор! — гэта-ж канец усіх унутраных спрэчак, незадаваленьняў, ранаў і болячкаў галоўнай рэлігійнай меншасьці (пасьля каталікоў) у Польшчы і ў тым ліку — большасьці беларускага народу! І вось, калі ўжо былі абʼяўлены дні, у якія праваслаўныя павінны былі выбіраць выбаршчыкаў і сяброў будучага Сабору,—раптам надыйшла другая вестка, што Сабор яшчэ не атрымаў дазволу ад міністэрства, чаго вымагаюць ад улады царкоўнай тыя самыя „тымчасовыя пшэпісы".

На падставе гэтага ў некаторых старостах, як напрыклад у Вільні, не дазволены нават і парафіяльныя сабраньні для выбараў выбаршчыкаў; у другіх старостах, напр. у Варшаве, выбары ўсёж-такі ідуць нармальным ходам, згодна з абʼяўленым парадкам, ня ведама толькі пакульшто, ці прыдзецца выбраным ехаць на сабор, г. ё. — ці адбудзецца самы сабор, ці не.

Мы зусім адмаўляемся рашаць незразумелае для нас пытаньне, якімі матывамі кіруецца сьвецкая ўлада, не даючы дазволу на Сабор. Пры ясна акрэсьленай свабодзе ўнутраньняга жыцьця Царквы ў Конституцыі, вымаганьне дазволу на Сабор у „тымчасовых пшэпісах" можна разглядаць толькі як фармальнасьць, якая можа перашкодзіць скліканьню Сабору толькі тады, калі за гэтай фармальнасьцю знаходзяцца нейкія іншыя грунтоўныя прычыны. Гэтых прычын улада нам не адкрывае, дзеля чаго мы магліб толькі задаць пытаньне, гдзе знаходзяцца гэтыя прычыны, — ці ў уладзе сьвецкай, ці ў вышэйшай уладзе царкоўнай, ці ў тэй і іншай разам? у астатнім выпадку ўся гэта гісторыя з Саборам — проста нейкая незразумелая палітычная ігра.

Тое, што праваслаўны мітрапаліт і Сынод неаднаразова ўжо прасілі аб скліканьні Сабору, тое, што мітрапаліт і цяпер прадаўжае прасіць і пратэставаць проціў яго недазволу, ўсё гэта быццам здымае віну з улады Царкоўнай.

Але... зьмест праграмы Сабору і тая агаворка, якую мы знаходзім у самым камунікаце мітрапаліта аб саборы, усёжтакі наводзіць нас на асьцярожныя думкі і сумнівы: ці шчырая ў гэтым пытаньні і сама вышэйшая царкоўная ўлада?

Першы Сабор Праваслаўнай Царквы ў Польшчы пасьля некалькі гадоў яе фактычна незалежнага існаваньня павінен быўбы быць для яе не звычайным, а нейкім **устаўадаўчым** сабраньнем, які павінен быўбы акрэсьліць перадусім кананічныя, а пасьля і юрыдычныя падставы яе існаваньня. Пераглядаючы праграму сабору, мы ўбачылі толькі адно пытаньне, — статут праваслаўнай царквы ў Польшчы, — якое мае ўставадаўчае значэньне для Царквы і Сабору, і зусім ня ўбачылі ніводнага кананічнага пытаньня, якія так горача абгаварываліся на старонках праваслаўнай прэсы і так, здаецца, балюча адзываліся ў жыцьці Царквы. Няўжож гэтыя балючыя і грунтоўныя пытаньні так і астануцца ня вырашанымі на Саборы? Міма волі зьяўляецца сумніў, ці ня страх перад гэтым пытаньнем змушае і адну, а можа і другую ўладу нядужа старацца аб саборы і ўжо наперад рабіць прыпушчэньне, якое мы бачым у афіцыяльным абʼяўленьні аб саборы, што калі Сабор сабраць будзе немагчыма, дык будзе сабрана нейкая мітрапалітальная нарада. У гэтым няпрыемна чуецца імкненьне абыйсьціся без Сабору, як вышэйшай царкоўна **ўставадаўчай** і **судовай** установы і замяніць яго нейкім выпадковым **народным** сабраньнем.

Але, як бы яно ня было, Сабор так патрэбны, што, ня гледзячы на ўсе сумнівы, трэба ўсімі сіламі старацца, каб ён адбыўся, і мы ад усяго сэрца шчыра жадаем нашым праваслаўным чытачом, каб гэты Сабор сабраўся і каб на ём бяз болю і бяз лішніх спрэчак вырашыліся ўсе жыцьцёвыя справы праваслаўнай Царквы ў Польшчы.

Праваслаўны Беларус

З польска-латвійскіх адносін.

У прошлым нумары „Б. Крыніцы" мы пісалі аб вялікай актыўнасьці польскай палітыкі ў адносінах да Латвіі. Гэтая актыўнасьць праяўлялася між іншым і закладываньнем таварыстваў польска-латвійскага збліжэньня. Гэтымі таварыствамі апякаваліся найвышэйшыя ўлады ў Польшчы і ў Латвіі, хочучы такім спосабам збліжыць абедзьве дзяржавы.

Аднак апошнім часам у польска-латвійскіх адносінах нешта папсулася — і папсулася якраз праз тыя-ж самыя таварыствы польска-латвійскага збліжэньня.

Як-жаж гэта сталася? А вось як. У сьнежні месяцы мін. году прыяжджала ў Вільню дэлегацыя ад Дзьвінскага таварыства выжэйназванага збліжэньня, каб навязаць цясьнейшую дружбу з польскімі кругамі. Віленскія польскія кругі, ведама-ж, прынялі такіх дарагіх гасьцей надта ветліва — стараліся дагадзіць чым мага. Як заўсяды бывае ў такіх здарэньнях, пастанавілі выслаць тэлеграмы да прэзыдэнтаў адной і другой дзяржавы: у Варшаву і Рыгу. Выслаць тэлеграмы ўзяўся адзін польскі ўрадавец, каторы выслаў тэлеграму ў Рыгу не на імя прэзыдэнта Латвіі але Латгаліі!...

Канцэлярыя латвійскага прэзыдэнта тэлеграму прыняла, але ня ведала, што з ею рабіць. Выслалі запытаньне ў Вільню, ці ня было часамі памылкі ў адрасе, але з Вільні прышоў адказ, што адрас быў падаены такі, які стаяў на тэлеграме, значыць прэзыдэнту Латгаліі, а ня Латвіі.

З гэтага і загарэўся ўвесь лес. Трэба ведаць, што Латгаліяй завуцца г. зв. „Інфлянты польске", бышая даўней польская правінцыя, дзе шмат каталікоў „польскай веры" і дзе шмат польскіх двароў. Гэтую правінцыю некаторыя польскія кругі ўважаюць за польскую, асабліва 6 гмінаў на паўдня ад Дзьвінска.

Дык выходзіла з тэлеграмы, што існуе нейкі асобны прэзыдэнт Латгаліі і што гэтаму прэзыдэнту з Вільні пасылаюць тэлеграму! Заграннічныя газэты падхапілі гэту вестку як сэнсацыю і вялікімі літэрамі абʼясьцілі, што існуе ўжо Латгальскі прэзыдэнт...

Гэтага Латвія не магла ўжо зьнесьці і спыніла работу таварыстваў польска-латвійскага збліжэньня. І так — назначаныя на 3 г. м. адведзіны Віленскім Т-вам Латвіі былі адложаны на неазначаны час, а само сьвяткаваньне 10-х угодкаў асвабаджэньня Дзьвінска ад бальшавікоў было перанесена ў Рэжыцу... Палаючы аб гэтым вестку, Віленскае „Słowo" (№ 6 с. г.) піша, што Рэжыца ёсьць златышаная, ня такая „польская" як Дзьвінск... (Дзіўна! Нам здавалася, што Рэжыца была заўсяды латышская, а тут даведываемся, што Рэжыца златышаная. Якою-ж яна была даўней? Няўжо польскаю?)

Вось дзеля гэтых прычын у польска-латвійскіх адносінах бачым цяпер нейкае ахаладжэньне. „Памылка" ў адрасе можа прывесьці да папсаваньня ўсей работы польска-латвійскіх таварыстваў.

Латвійскія беларусы павінны на гэты факт зьвярнуць вялікую ўвагу.

З Беларускага жыцьця.

З БЕЛАРУСІ ПАД ПОЛЬШЧАЙ

З дзейнасьці Бел. Пас. Клюбу. У апошнія часы Беларускі Пасольскі Клюб падаў у Сойме дзьве інтэрпэляцыі: 1, у справе біцьця паліцэйскім у Новай-Мышы Баранавіцкага пав. А. Мазуры і Я. Нарбутовіча і 2, ў справе біцьця паліцэйскім Т. Усьціновіча ў Дзісьне.

Яшчэ адзін суд над Б. Тарвшкевічам. Дня 24 г. м. мае адбыцца суд над Б. Тарашкевічам за зроблены ім мітынг у Вільні ў 1926 г.

Далейшае выдаленьне вучняў з Віленскай Бел. Гімназіі. Апрача выдаленых у апошнія часы 6 вучняў, па загаду польскіх школьных уладаў выдалены яшчэ два вучні VI клясы : Мілюк і Стаўбунічанка.

Новая беларуская кнігарня. У Вільні адчынілася яшчэ адна беларуская кнігарня, заложаная навапаўстаўшым Т-вам „Рунь„.

Судовае следзтва над рэдактарам і выдаўцом „Шляху Моладзі". Судзьдзя следчы на м. Вільню заклікае на 20 г. м., як „падазроных" рэдактара „Шляху Моладзі" М. Пяцюкевіча і выдаўца Я. Багдановіча.

„Наталка Палтаўка" Катлярэўскага, опэрэтка ў 3-х актах, пабеларуску. 11 г. м. у салі Віл. Бел. Гімназіі адбыўся суботнік-спэктакль. Адыграна опэрэтка „Наталка Палтаўка".

З студэнскага жыцьця. Дня 4 г. м. ў Празе (Чехаславаччына) адбыўся пяты зьезд Аб'яднаньня Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў (АБСА). На старшыню Ўраду выбраны В. Лаўскі.

Зьезд вынес пратэст супроць праследаваньня Беларусаў праз чужацкія ўлады і заклік да творчае і пазытыўнае працы на грунце беларускага адраджэньня. Зьезд выразіў так-жа спачуцьцё ўсім пацярпеўшым ад тэрору ў Радавай Беларусі.

Аб Беларускім Студэнскім Саюзе ў Вільні. У Празе чэскай, як сказана вышэй, 4-га г. м. адбыўся зьезд Аб'еднаньня Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў (АБСА). На гэтым зьездзе павінны былі быць і былі прадстаўнікі Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні.

Як даведываемся, на гэтым зьезьдзе рэпрэзэнтавалі Віленскі Беларускі Студэнскі Саюз — Ст. Станкевіч і А. Бартуль.

Даведываемся так-жа, што агульны сход Віленскага Бел. Студ. Саюзу прадстаўнікоў на зьезд АБСА не дэлегаваў, не зважаючы на тое, што некаторыя студэнты дамагаліся скліканьня агульнага сходу дзеля выбараў дэлегатаў на зьезд АБСА; аднак чамусьці агульны сход скліка्ны ня быў і прадстаўнікі на зьезд АБСА паехалі без поўнамоцтваў сходу Беларускага Студэнскага Саюзу.

Гэта ўважаем за супярэчнасьць з прынцыпамі дэмакрацыі, што і змушае нас забраць у гэтай справе голас. Няўжо Статут Бел. Студ. Саюзу так агранічае правы агульнага сходу, што дае яму права толькі выбараў ураду? Калі так, дык варта такі статут зьмяніць і пашырыць дзейнасьць усіх сяброў саюзу, бо такі статут не дае магчымасьці студэнскай моладзі разьвіваць ініцыятывы і шырэйшай дзейнасьці. На гэта наша студэнская моладзь павінна зьвярнуць увагу і недарэчнасьці направіць.

Прадстаўленьне ў Шаўлянскай беларускай школе, Браслаўскага пав. Дня 29. XII 1929 г. у Шаўлянскай школе, пад кіраўніцтвам вучыцелькі М. Булыгавай, адбылося вучнёўскае прадстаўленьне. Адыграна п'еса „Шчасьлівы Муж" Ф. Аляхновіча. Народу было шмат.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Крыху аб гадаўлянай гаспадарцы калгасаў. Побач з камуністычнай гаспадаркай у „калхозах" (калектыўных гаспадарках) існуюць у Радавай Беларусі і сындыкаты „кожсыр'я" — сырых скураў. Як адна, так і другая арганізацыя — камуністычныя. Розьніца між імі толькі тая, што „колхозы" вядуць гаспадарку рольную і гадаўляную, а сындыкаты „кожсыр'я"; зьбіраюць толькі скуры і адпраўляюць іх у фабрыкі, або заграніцу. Дзеля таго, што камуністы найбольш увагі зьвяртаюць на фабрычную прамысловасьць і вываз сваіх тавараў за граніцу, „колхозы" становяць часта, як тэрыторыю эксплёатацыі сыр'я для фабрык. А тая гаспадарчая галіна, якая празначана для эксплёатацыі на карысьць іншай гаспадарчай галіны і пры тым ня маючая кіраўніка-абаронцы гэтай галіны, як сваей уласнасьці, заўсёды бывае вызыскана гэтай другой галінай эксплёатуючай. Так сталася і ў камуністычнай гаспадарцы Б.С.Р.Р. — у гаспадарцы „колхозаў" з сындыкатам „кожсыр'я". Паводле аблічэньня Наркомзема (Народны Камісар'ят Земляробства), у першым квартале сёлетняга гаспадарчага году у ва ўсіх „колхозах" Радавай Бнларусі забілі на скуры для сындыкату „кожсыр'я" 52 тысячы коняў. Каля 30 проц. забітых коняў згодных да працы, а 10 проц. жарабят ад 6 да 10 месяцаў. Такім чынам забілі каля 25 тысяч коняў толькі дзеля скуры, якія мелі вартасьць куды большую, як усе скуры 52 тысяч коняў.

* * *

Божа мой, ў вышыне,
Адкажы мне хутчэй,
Ці Ты чуеш, ці не
Плач старонкі маей?

Крыўда разам з бядой
Цісьне нас як турма;
У нас праўды сьвятой
Тут і сьледу няма.

Ці з касой на лугу,
Ці за плугам ідзеш—
Ўсюды чуеш тугу
І сам сьлёзы ліеш.

Божа вечны, сьвяты,
Слаўны Праўдай сваёй,
О, даведайся Ты
Аб старонцы маёй!

Коко.

З Літоўскага жыцьця.

З НЕЗАЛЕЖНАЙ ЛІТВЫ

Юбілей Вітаўта. У сёлетнім годзе ў літоўскім грамадзянстве зазначаецца нябывалае ажыўленьне з прычыны прыпадаючых 500-ых угодкаў сьмерці Вял. Кн. Літ. Вітаўта. Нядаўна ў Коўне паўстаў адумысловы К—т для сьвяткаваньня гэтага юбілею. На чале К—ту стаў галава места Коўны І. Вілейшыс. Камітэт гэты пацьверджаны міністэрствам асьветы.

Шмат хочуць. За Клайпэду і прылягаючую да яе тэрыторыю міжнародная разрахунковая камісія вызначыла ў сваім часе Літве плату 64 мільёны марак. Вось-жа літоўскі ўрад уважае гэту суму за дужа высокую і ўжо апрацовывае ў гэтай справе адумысловы мэморыял. Урад апіраецца на тым, што Клайпэда, як і агулам Літва, падчас вайны была арэнай бітвы і пацярпела больш, як іншыя краі.

З ЛІТВЫ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Аб літоўскай школе. Пачатковых літоўскіх школ пад Польшчай ёсьць даволі значны лік, але за выняткам 3—4, усе яны прыватныя, утрымліваныя на кошт літоўскага прасьветнага таварыства „Rytas". Пры закладаньні школ ёсьць многа труднасьцяў з боку польскіх уладаў, якія ня маюць усталенай палітыкі, што да літоўскіх школ.

Існуюць дзьве літоўскія гімназіі: адна ў Вільні, а другая ў Сьвянцянах. У Вільні — 340 вучняў, а ў Сьвянцянах — 240. Віленская гімназія прыватная, але з правамі. Сьвянцянская — бяз праў. Матурысты гэтай гімназіі, жадаючы здабыць правы, каб магчы паступіць у польскія ўнівэрсытэты, мусяць здаваць экзаміны ў літоўскай віленскай гімназіі, або ў польскіх гімназіях урадавых. Абедзьве гэтыя гімназіі ўтрымлівае тое-ж Т-ва „Rytas".

Юбілей Вітаўта. Літоўскае грамадзянства пад Польшчай ужо так-жа рыхтуецца да сьвяткаваньня 500-лецьця сьмерці Вял. Кн. Літ. Вітаўта. Як пісалі мы ў прошлым нумары нашай часопісі, Т-ва сьв. Казіміра выдала ў гэтай справе адпаведную адозву, заклікаючы прадусім сваіх сяброў да належнага сьвяткаваньня юбілею Вітаўта. Цяпержа, як даведываемся, пры Літ. Тымч. К-це ўтварылася адумысловая сэкцыя, маючая на мэце заняцца сьвяткаваньнем гэтага юбілею.

З Польшчы.

Паседжаньні Сойму і сэнату. Пасьля калядняга перарыву паседжаньне Сойму пачалося 15 г. м., а паседжаньне сэнату 16 г. м.

Зьмена маршалка сэнату і маршалка сойму. Маршалку сэнату сэнат мае выразіць недавер, а маршалак сойму Дашынскі, паводле чутак, хоча сам падацца ў адстаўку.

З **працы соймавай буджэтнай камісіі. Гутарка аб дыспозыцыйных сумах.** На паседжаньні буджэтнай камісіі дня 4 г. м. у часе дыскусіі эндэк Тромпчынскі гаварыў, што сьвежа-спечаныя дзяржаўныя дастойнікі вядуць жыцьцё „залатой моладзі" забываючыся, што грамадзянства пытаецца ад куль яны бяруць на гэта грошы? Паўстае падазрэньне, што гэтыя грошы (на гулянкі) паходзяць з дыспозыцыйных сум. Ходзяць чуткі, што **адзін міністар ужыў дыспозыцыйных сум на купно бялья лля сябе і для сваей жонкі.** Далей гаварыў ён, што кожны ваявода і стараста спраўляюць аўтамабілі на 6, 7 і 9 тысяч даляраў, відавочна не за свае грошы, але з падаткаў. Пасол з П.П.С. Чапінскі заявіў, што ўрадоўцы і паліцыя займаюцца агітацыяй, зьбіраюць падпісную плату на санацыйныя газэты і г. п.

Прэм. Бартэль заявіў, што гэта ёсьць не ўпарадку і ён пастараецца гэта ўсё направіць.

Пажывём — пабачым...

Падслуханы сакрэт. У Варшаве трапілася здарэньне, што гутарка праз тэлефон прэм. Бартэля з прэзыдэнтам, якая была важнай і відавочна тайнай, паявілася ў бюлітэні „Ўсходняй Агенціі". Відаць сакрэтная гутарка праз тэлефон была падслухана, але праводзячае ў гэтай справе судовае сьледзтва пакульшто нічога пэўнага ня выкрыла.

З заграніцы.

Сэсія Лігі Народаў. У Жэнэве 13 г. м. адкрылася 58-ая Сесія Лігі Народаў. На сэсію з'ехалася многа міністраў заграніічных спраў рожных дзяржаваў. Газэты падаюць, што францускі міністр Бріян хоча гэту сэсію Лігі выкарыстаць дзеля разьвіцьця думкі аб стварэньні эўрапэйскай эканамічнай фэдэрацыі. Гэта думка ёсьць скіраванай проціў амэрыканскай такой-жа палітыкі, у сетках якой знаходзіцца і сама Францыя.

Фальшывымі грашамі хацелі зрабіць контррэволюцыю ў Расеі. У сталічным месьце Нямеччыны Бэрліне адбываецца сэнсацыйны судовы працэс над фальшоўнікамі бальшавіцкіх грошаў — чырвонцаў. З гэтага працэсу даведываемся, што грузінскія эмігранты з мэтай вызваленьня Грузіі з пад маскоўскай няволі пачалі друкаваць у Нямеччыне бальшавіцкія фальшывыя чырвонцы.

Падсудныя выясьняюць, што гэты плян паўстаў у грузінскіх вызваленцаў у 1926 г. Паводле гэтага пляну мела быць так: выдрукаваныя мільёнамі фальшывыя чырворцы мелі быць перавезеныя ў Расею і пушчаныя там на рынак. Гэта прычынілаб да ўпадку бальшавіцкіх грошаў, а разам з гэтым выклікала-б агульны гаспадарчы крызыс у Расеі. Тады на Каўказе мелася адбыцца паўстаньне, якое перакінулася-б і на іншыя землі С.С.Р.Р., а галоўна на Украіну. Такім чынам Грузія вызвалілася-б з пад расейскай няволі і сталася-б вольнай, незалежнай.

Гэты плян быў на столькі рэальны, што да яго прылучыліся і некаторыя немцы на чале з ведамым генэралам Гофманам і некаторыя амэрыканцы, зацікаўленыя ў нафтовым промысле, а так-жа між іншымі і сын слаўнага шведа Нобля.

У канцы 1926 і ў пачатку 1927 году арганізацыя пачала друкаваць фальшывыя чырвонцы. Выдрукаваныя фальшывыя чырвонцы нічым не адрожніваліся ад сапраўдных. Заграніічныя банкі прыймалі іх без ніякіх засьцярогаў. Але ўсё мае свой канец.

Транспарт чырвонцаў высланы ў Расею пералавіла нямецкая паліцыя; усё выявілася і арганізатары апынуліся ў вастрозе, а цяпер гэта справа разглядаецца бэрлінскім судом.

У Англіі лік безработных з кожным годам павялічываецца. Ужо ад некалькіх гадоў Англія мае вялікі клопат з безрабоцьцем. Не зважаючы на тое, што ўрад стараецца ліквi-

даваць безрабоцьце, лік безработных ня то што не зьмяншаецца, але штораз павялічываецца. У працягу апошніх двух тыдняў безработных прыбыло на 200 тысяч і цяпер налічываецца безработных агулам паўтара мільёна асоб.

Змаганьне бальшавікоў з рэлігіяй і сялянствам у С.С.Р.Р. У дні каляднага сьвята бальшавікі на ўсей тэрыторыі С.С.Р.Р. ладзілі проціўрэлігійныя дэманстрацыі.

Бальшавіцкія газэты пішуць, што ў Тверы камсамольцы з прыватных памешканьняў назьбіралі больш 2.000 рэлігійных абразоў і дэманстрацыйна палілі на пляцох места. Камсамольцы ўрываліся ў прыватныя кватэры і загадвалі аддаваць абразы ў доказ „бязбожнасьці“.

У Варонежы бальшавікі даканалі кашчунства над мошчамі Мітрофанія Варонескага. Да кашчунства былі прымушаны і прадстаўнікі мясцовага духавенства. Пасьля зьдзекаў над мошчамі пастаноўлена закрыць існуючыя ў тым раёне 40 манастыроў, дзе знаходзіцца каля 1000 манахаў і манашак. Адначасна пастаноўлена зьняць усе званы ў Варонежы. У Чарнігаве адабраны ўсе званы. У Таганрогу закрыты ўсе цэрквы. Гэтакія і падобныя рэчы адбываліся ў ва ўсіх местах С.С.Р.Р. У Маскве камсамольцы пад кіраўніцвам старэйшых камуністаў ладзілі дэманстрацыю „пахаронаў“ царквы і рэлігіі. Зроблены модэль царквы вазілі на аўтамабілі па вуліцах. Гэты аўтамабіль з модэлям царквы акружалі пераадзетыя ў царкоўныя рызы камсамольцы, за аўтамабілем з модэлем царквы вязьлі труну з надпісам „рэлігія“. Гэты караван астанаўліваўся на найбольш залюдненых пляцох і камсамольцы ў царкоўных рызах з крыжам у руках гаварылі проціўрэлігійныя прамовы. На заканчэньне ўсяго гэтага зрабілі „пахароны“ рэлігіі — палячы модэль царквы і тую труну з надпісам „рэлігія“, а так-жа і тую вопратку — рызы, у якую былі адзеўшыся на дэманстрацыю камсамольцы. Нешта дзікае!

* * *

Як мы ўжо пісалі ў прошлым нумары, цяпер бальшавікі пачалі ліквідаваць уласныя сялянскія гаспадаркі і пераганяць сялян у камуну. Сяляне, ня бачачы ратунку ад камуны, а хочачы хоць у апошні раз скарыстаць з сваей маемасьці, пачалі рэзаць апошнія свае каровы. Бальшавікі, каб забараніць сялянам гэта рабіць, апрацавалі закон, які карае сялян за зарэзаньне скаціны вастрогам, а ў іншых выпадках і сражэй, можа нават і карай сьмерці.

Дажыўся селянін, што нават і барана для сябе зарэзаць ня мае права!

Аб гаспадарцы.

Куры ўзімку.

Шкода вялікая, што дробнае землеробства наша дагэтуль як-бы не дацэнівала і ўсьця-ж не дацэнівае йшчэ таго, што могуць даць яму **куры**. Трэба на гэта аднак крыху стараньня аб курах і з боку самога земляроба, асабліва-ж **зімой**, калі трэба старацца забясьпечыць іх ня толькі ад голаду, але і ад холаду.

Найбольш чуткімі на холад бываюць куры на грабяні, якія перадусім пабледнуць, пасьля чарнеюць і — часта — нават ападаюць. Усё гэта спраўляе курам вялікую боль: куры пасьля гэтага перастаюць несьціся, а пеўні стаюцца бяздзейнымі. Каб да гэтага не дапусьціць, трэба паблянеўшыя грабяні неадкладна змазаць якойнебудзь **нясоленай** клустасьцю, напр. вазэлінай, гліцэрынай, а нават шмальцам. Добра бывае таксама намазаць грабяні курэй тэй-жа клустасьцю йшчэ перад маразамі...

Але ня толькі ад адмарожываньня грэбеня трэба курэй сьцерагчы: іх трэба памясьціць па магчымасьці ў цёплых і сьветлых курнікох. Ня ўсюды гэта можна, але дзе гэтага няма, там і карысьць малая з усяе гадоўлі. Трыманьне курэй у цёмных, душных катухох ад марозу іх не забясьпячае. На гэта ёсьць лякарства іншае: курэй трэба ўсячкімі спосабамі змушаць перадусім да руху. Робіцца гэта ўсяляк, напр. зярняты збожжа разсяваюцца нейдзе за ветрам у мякіну, сечку, або салому: шукаючы гэтых зярнят куры капаюцца і гэтым самым саграваюцца.

Галоўкі капусты, кормнай морхвы, або бурака вешаюцца так высока, каб куры маглі дастаць іх дзюбаць толькі падскоківаючы — таксама саграваюцца; „купаньне“ курэй у пяску мае тую самую мэту. Урэшце ежа: лепш даваць маразамі адну і тую-ж порцыю двойчы і да таго цёплую, чымся адзін раз усю. Вада да піцьця мае быць таксама цёплая. Нанач даецца курам ежа з зярнят — яны „грэюць“ праз ноч, — а ў дзень — бульба з абмешкай. „Прысмакам“ для курэй ёсьць кіслая капуста: жменя **сагрэтай** капусты папраўляе апэтыт курэй і пабуджае іх да нясеньня.

(З працаў Інж. Ад. Клімовіча.)

Да нас пішуць.

З НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ.

Нясьвіскі пав. Ну і жыцьцё! Вот дык лёс, хоць ты вазьмі і жывы ў яму кладзіся. Працуеш цэлы год, як чорны вол, а на патрэбу і зламанага гроша няма. Заўсёды гэтая беднасьць, гора, галіта. Заўсёды абдзёршыся, недаеўшы. Ня хочаш есьці бяз солі— салі самай найчарнейшай соляй. Хочаш курыць — куры замест табакі ўсялякае сьмяцьцё і маўчы, бо на лепшае грошаў не хапае.

А нашыя хаты? — сажань кругом, а ў хаце 10-15 душ. Пры такіх варунках жыцьця трудна ўсьцярагчыся і ўсялякіх хваробаў. Вельмі густа спатыкаюцца людзі хворыя на сухоты. Маладзяж мае выгляд бледны і вельмі нэрвовая. Дзеці ўміраюць сотнямі.

Апрача галіты матэр'яльнай ня меншая галіта пануе і духовая.

Паводле пісанага права—польскай канстытуцыі, лічымся поўнапраўнымі і роўнапраўнымі грамадзянамі краю, але гэта паводле права пісанага, паводле канстытуцыі. А на практыцы кожны ведае як.

Пойдзеш у воласьць з якімі інтарэсамі, калі ўмееш папольску, то добра, залатвіш сваю справу, а калі ня ўмееш — шукай „адваката“. Зойдзеш у царкву, або ў касьцёл і тут чуеш сябе чужнікам. Чуеш расейскую мову ў царкве, польскую ў касьцеле, а сваю родную беларускую пачуеш толькі за парогамі гэтых сьвятыняў на нашай зямлі, у сянёх казённых упраў, дзе сяляне нараджаюцца як зьвярнуцца да таго ці іншага пана і ў „вольнай“ беларускай вёсцы. У сьвятыні стаіць наш селянін, глядзіць на мэханічнае літургічнае набажэнства і нічога да яго ня клеіцца. А ў казённай упраўе дык толькі пацее ад высілкаў, каб як колечы залатвіць сваю справу і пасьля з гэтымі ўрадоўцамі больш не спатыкацца.

А ў хаце нашага селяніна, як выглядае? А вось як—хоць ваўкоў ганяй,—халадна. Заўсёды пост. Дзеці хворыя — лячыць няма за што, жонка плача... Каб ня бачыць гэтага, селянін-гаспадар уцякае з хаты на панадворак, дзе так-жа адразу кідаецца ў вочы ўпадак жыцьця: хлявы, гумно і інш. будынкі разваліваюцца, цякуць... Увойдзе ў хлеў—сэрца баліць, гледзячы на высахшую кабылку, кашляючую карову і апіраючуюся аб сьцяну, каб не паваліцца сьвіньню. Недахват ня толькі хлеба, але і сена і саломы. Корміць наш селянін скаціну так, каб яккалечы стачыць, як кажуць, канцы з канцамі і пратрымаць яе да травы.

Калі-ж міне ўсё гэта? Калі прыдуць лепшыя часы? Што будзе далей? — Вось думкі і гутаркі нашых сяньян.

Мужычок.

БЛАГА ЖЫВЕЦЦА.

в. М.-Волхва, Баранавіцкага пав. У нас беларуская сьведамасьць даволі моцная. Усе добра ведаюць, што наш край ня ёсьць ані краем рускім, ані польскім, а беларускім. Ніхто не называе сябе ані рускім, ані палякам, а беларусам. Словам, нацыянальная сьведамасьць ужо моцная. Адна бяда, дык гэта тая, што каля нас вельміж моцна пануе бедната.

Сялянскія гаспадарачкі маленькія, працаваць няма на чым, заработкаў няма нідзе, а жыць трэба. Вось тут дык і выхаду няма. Выхад то знайсьці можна, але гэта залежыць ад польскага ўраду. А выхад з гэтага нашага труднага палажэньня — гэта справядлівая рэформа рольная. Хоць гэтая справа амаль выключна залежыць ад польскага ўраду, але каб сяляне маглі крапчэй гэтага дамагацца, трэба арганізавацца ўсім у вадну сваю беларускую арганізацыю. Гэтай адной беларускай арганізацыяй, якая дамагаецца сялянам зямлі бяз выкупу на ўласнасьць — ёсьць Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя (Б. Х. Д.).

Дык трэба запісывацца ў гэту арганізацыю і арганізаваным парадкам дамагацца належных нам правоў як нацыянальных так і соцыяльных. Ш. І.

НЕ РАСЕЙЦЫ, НЕ ПАЛЯКІ, А БЕЛАРУСЫ

в. **Макаўляне**, Сідараўскай гм. Сакольскага пав. Наша вёска даволі вялікая, каля 100 гаспадароў. Усе яе жыхары беларусы праваслаўныя і каталікі. Як праваслаўныя, так і каталікі гавораць толькі пабеларуску. Нясьведамыя праваслаўныя называюць сябе рускімі, а каталікі палякамі. Часта адны другіх называюць „кацапамі“ і „саламянымі палякамі“, нават часта за гэта сварацца.

Дарагія браты, макаўляне, праваслаўныя і каталікі! Стыдна нам сварыцца між сабой і называць сябе ня ўласным імем, або празываць адны другіх „кацапамі“ і „саламянымі палякамі“. Мы належым да аднае беларускай народнай сям'і — мы ўсе беларусы. Як каталікі, так і праваслаўныя каратаем гора і церпім адну і тую самую бяду. Залічываюць нас да палякоў толькі ў касьцеле, а да расейцаў у царкве, залічвае ў некаторых выпадках фармальна гэтак і польская палітыка. Інтэрас наш агульны вымагае быць нацыянальна сьвядомымі і жыць у поўнай дружбе праваслаўныя з каталікамі і наадварот, бо мы належым да аднаго народу Беларускага.

Даволі ўжо жыць у нязгодзе каталіком з праваслаўнымі, нам трэба супольна змагацца за супольныя нашыя правы. Праваслаўныя няхай будуць праваслаўнымі, а каталікі каталікамі; як праваслаўе, так і каталіцтва няхай будзе ў пашане нашага народу. Нам трэба здабываць свае правы і ў царкве і ў касьцеле. Трэба нам так-жа дамагацца супольна і справядлівай рэформы рольнай, на раўні як для праваслаўных, так і для каталікоў.

Дык нахай згінуць у нас сваркі. Чытайма ўсе адну нашу родную газэту „Б. Крыніцу“, а яна нам пакажа шлях да лепшай будучыні.

Макаўлянец.

БЛАГІЯ НАВЫКІ, ЯКІЯ ГАНЬБЯЦЬ ЧАЛАВЕКА.

в. Клочкава, Маладэчанскага пав. Ніхто такім ворагам ня можа быць другому, як з благімі навыкамі чалавек сам сабе. Калі здарыцца, што адзін у другога што небудзь украдзе — наракальням і канца няма, ведама шкода зроблена. Украдзенага шукаюць, а злавіўшы злодзея, судзяць. А як чалавек сам сабе робіць шкоду, сам сябе акрадае, дык і нічога.

У нашай вёсцы завялася мода іграць у карты (ў 21). Гэтая разбойнічая забаўка губіць ігракоў куды горш, як злодзей. Адны другіх аб'ігрываюць, за выйгрышы пьюць гарэлку і б'юцца.

Дарагія браты! Ратуйцеся ад гэтага згубнага навыку. За той грош, які вы ставіце „ў банк“ выпішце родную газэту і, замест гэтай згубнай ігры ў „21“, чытаўце яе.

Газэта будзе даваць вам карысьць, бо будзе вас прасьвячаць. З газэты вы даведаецеся як жывуць іншыя народы, як змагаюцца за свае правы, даведаецеся так-жа, якім спосабам можна паправіць свой лёс і нам. Газэта вучыць так-жа і гаспадаркі; там вы даведаецеся, як абрабляць поле, каб мець лепшы ўраджай і як гадаваць добрую скаціну.

Дык прэч з стала і з рук карты, а іх мейсца няхай зойме родная беларуская газэта!

П. Ман-цкі

КСЁНДЗ ПРАЦІЎНІК БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭНЬНЯ.

Табарышкі, каля Вільні. Моладзь у нашай парахвіі, ідучы за прыкладам іншых мяйсцовасьцяў Заходняй Беларусі, пачала

працаваць на карысьць свайго сярмяжнага народу, сваей гаротнай Бацькаўшчыны. На перашкодзе гэтай працы стануў кс. В.-Карачэўскі, Табарыскі пробашч. Ён стараецца беларускі рух у пад Віленскіх Табарышках здушыць. Хоць яму гэта неўдаецца і пэўна што ня ўдасца — усёжткі ён высілаецца беларускі рух спыніць.

Гэты апостал польскасьці загадвае парафіянам, каб выпісывалі ксяндзоўска-панскую газэціну „Nasz Przyjaciel" і яе тыкае ў рукі нашых вяскоўцаў захваліваючы, што надтаж добрая газэта. Але нашы сяляне добра ведаюць гэтага „N.-Przyjaciela" і называюць гэту газэціну „нашым ворагам". І сапраўды гэты „N.-Przyjaciel" ёсьць такім-жа „прыяцелем" для нашага гаротнага беларускага народу, як і кс. В. Карачэўскі.

Вельмі моцна гэты ксёндз змагаецца з гуртком Б. І. Г. і Культуры, які ў нас даволі добра разьвіваецца. Гэты ксёндз у сваім змаганьні з беларускасьцяй ужывае нават і амбоны.

Ксяндзочку, нявартa змагацца з той праявай, якая ня ёсьць у супярэчнасьці з ідэалёгіяй хрысьціянскай і якая праяўляецца паводле прадвечнага закону Божага. Беларускі народ жыў, жыве і жыць будзе. Дык на што-ж тыя высілкі трымаць яго ў нясьведамасьці? Ці ня лепш падаць руку жадаючым выйсьці з няволі нясьведамасьці да жыцьця нацыянальнай сьведамасьці. Гэтаму здаецца навука Хрыстусовая ня толькі не пярэчыць, але наадварот — ідзе на спатканьне і багаславіць.

Ян Мiсевіч.

З краю.

Напады ваўкоў. Хлівічы, Дзісьненскага пав. Ваўкі ў ночы палкапаўшыся ўлезьлі ў хлеў і забралі 4 авечкі. Здараюцца выпадкі, што ваўкі нападаюць на падарожных адзінокіх людзей. Адміністрацыйныя ўлады арганізуюць на ваўкоў аблаву.

Арлы на Беларусі. Няведама, адкуль браліся і зьявіліся ў Дзісьненскім павеце арлы. Дня 23.XII — 29 г., праходзячы праз лес селянін з вёскі Сямёначыкі Празароцкай гм. Дзісненскага пав., заўважыў на дрэве седзячых 3 вялікія птушкі. Зацікавіўшыся іх вялічынёй, стаў селянін на іх прыглядацца. Дзьве гэныя вялікія птушкі спужаўшыся паляцелі, а адна напала на селяніна. Селянін пачаў бараніцца кіем і некалькімі ўдарамі забіў гэту птушку. Забітую забраў дамоў, разгледзіўшы пазнаў, што гэта арол.

Баптысты стараюцца баламуціць беларускіх сялян. Каля Радашкавіч „апосталы" — сэкты баптыстаў ужо ад некаторага часу стараюцця зьвіць сабе гняздо і затрувацъ душу нашага народу. Але, як даведываемся „місія" гэта ім не ўдаецца. Беларускі селянін гоне іх.

Наша пошта.

Я. Шостаку. Газэту пашлём з 1.II-30 г.

Я. Кірмашнаму. З карэспандэнцыі скарыстаем, пішыце больш.

Тутэйшаму. З заметкі скарыстаем. Пры карэспандэнцыі апрача псэўдоніма трэба падаваць праўдзівае сваё прозьвішча і дакладны адрэс.

Зубіку Мікалаю. Газэту пасылаем, прысылайце падпісную плату.

Рамановіч В. Газэту пасылаем.

Радіану К. Газэту пасылаем, не забывайце аб падпісцы

Ліпінскаму Я. „Б. К." пасылаем, прысылайце падпіску.

Кажурне. Л. Грошы атрымалі, газэту пасылаем акуратна. З карэспандэнцыі скарыстаем.

Бураку Гр. Газэту пасылаем, чакаем абяцанага.

Дубаневічу К. у Францыі. Шчыра дзякуем за прывітаньні. Газэту таму не акуратна атрымлівалі, што зьмянілі Вы свой адрэс і нас аб гэтым не паведамілі.

В. Грыню. Газэту пасылаем, прысылайце падпіску.

Блажуку Сьцяпану. Газэту пасылаем, прысылайце падпіску.

Новіку С. За сьвяточныя пажаданьні шчыра дзякуем, з матэр'ялаў скарыстаем, пішыце больш.

Я. М. З карэспандэнцыі скарыстаем, пішыце больш.

Падпіску атрымалі ад: адваката П, Сьвірыда 6 зл. А. Кірэпі, Бел. Гімн. ў Наваградку па 3 зл., А. Бурачонка 2 зл. П. Татарыновіча. Е. і Б. Будзькаў па 5 зл. Я. Спургяжа, М. Бунара, В. Кірэя па 3 зл.; дзякуем, газэту пасылаем.

Каталёг

(Кнігасьпіс)

беларускіх кніг уласных кнігарні „Пагоня" (Wilnia, Ludwisarskaja Nr 1), а такжа ўзятых на продаж ад іншых выдавецтваў.

Г.

Гарэцкая Л. — Родны край. Першая пасьля лемантара кніжка. Выд. 4-е Выд. Бел. Т-ва. Вільня, 1926 г. Стр. 90+VI. Цана 1,20

Гарэцкая Л. — Родны край II-ая пасьля лем. кніжка да чытаньня. Выд. перарабл. і дапоўненае В. Клецкіна. Вільня, 1923 г. Стр. 156. Цана . . 3,00

Гарэцкая Л. — Родны край. III і IV пасьля лем. кніга да чытаньня. Выд. Т-ва Бел. Школы. Вільня, 1921 г. Стр. 208. Цана 3,00

Гарэцкі М. — Гісторыя Беларускае Літэратуры Выд. II-е Б. Клецкіна. Вільня, 1921 г. Стр. Цана 3,90

Гарэцкі М. — Хрыстаматыя Беларускае Літэратуры XI век — 1905 г. Віл. Выд. Б. Клецкіна. Вільня, 1923 г. Стр. 264. Цана 5,00

Гарэцкі М. Атрута. Абразок у 1 акце. Бел. Выд. Т-ва. Вільня, 1927 г. Малюнкі з сялянскага жыцьця. Стр. 16. Цана 0,30

Гарэцкі М. — Дзьве душы. Выд. Бел. Выд. Т-ва. Вільня, 1920 г. Повесьць з часоў рэвалюцыі 1917 г. Стр. Ц. 1,50

Гарэцкі М. — Рунь. Выд. Бел. Выд. Т-ва. Вільня, 1914 г. Зборнік апавяданьняў з пачаткавай творчасьці аўтара. Стр. 136. Цана 1,75

Гарэцкі М. — Антон. Абразы з сялянскага жыцьця. Вільня 1919 г. Стр. 130. Цана 1,50

Гарэцкі М. — Невялічкі Беларуска-Маскоўскі Слоўнік. Бел. Выд. Т-ва Крыніца. Вільня, 1919 г. Стр. 162 Ц. 2,00

Гарэцкія М. і Г. — Маскоўска-Беларускі Слоўнік. Выд. II Выд. Знамяроўскага Вільня, 1921 г. Стр. 144. Цана . . 1,25

Гарэцкі М. — Мутэрка. Вільня 1921 г. Драматычны абразок з жыцьця вясковай інтэлігенцыі.

Гнатышак Др. Мікола. — З сучаснае Мастацкае прозы Нямеччыны. Пераклаў з украінскага Аўгень Бартуль. Выд. Бел. Выд. Т-ва. Вільня, 1928 г. Стр. 27. Цана 0,35

Гоголь М. — Тарас Бульба. Віл. Выд. Б. Клецкіна. Вільня, 1929 г. Ведамая расейская повесьць. На беларускую мову пераклаў Краўцоў Макар. Стр. 144. Цана 2,75

Грыневіч А. — Навука сьпеву. (Правілы і практыка). Выд. аўтара. Вільня, 1923 г. Стр. 40. Цана 1,50

Грыневіч А. — Дзіцячы сьпеўнік. Выд. Грыневіча Вільня, 1928 г. Стр. 32. Цана 1,20

Грынкевіч А. — Як трымацца змалку. Выд. аўтара. Вільня, 1920 г. Кароткія ўзгадаваўчыя ўвагі. Стр. 16. Цана 0,25

Hrynieŭski W. — Ab trusoch. Wyd. Bieł. K-tu, Wilnia, 1918 h. Str. 15, Cana . . 0,15

Hrynkiewič St. — Arlanio. Wyd. Bieł. Krynicy. Wilnia, 1927 h. Raskazik z biełaruskaha wiaskowaha žyćcia. Str. 52 C. 0,30

Hrynkiewič St. — Žanimstwa pa radjo. Pjesa ŭ 3-ch abrazoch (Sučasny malunak) Wyd. „B. Krynica." Wilnia, 1927 h. Str. 88. Cana 0,50

Hrynkiewič St. — Carkwa, Pomsta, Wiaźnica. Wyd. Bieł. Krynicy." Wilnia, 1928 h. Apisańnie doli maładoha Biełarusa, jaki imkniecca da nowaha narodnaha žyćcia, a jakomu stajać na pieraškodzie niepamiernyja čužackija siły. Str. 126, Cana 1,00

Hrynkiewič St. — Ab teatry. Wyd. „Bieł. Krynicy." Wilnia 1927 h. Praktyčny padručnik dla amatarskich teatraŭ. Str. 53 C. 0,50

Hrynkiewič St. — Narod. Wyd. „B. Krynica." Wilnia, 1927 h. Sproba adznačeńnia, što takoje narod? Str. 32, Cana 0,35

Грышкевіч Фр. Веснавыя мэлёдыі. Выд. Бел. Інст. Гасп. і Культуры. Вільня, 1927 г. Зборнік Вершаў. Стр. 77. Цана 1,00

Гутоўскі У. Д. — Сурдут і сярмяга. Драматычны абразок з песьнямі і танцамі ў 3-х актах. Выд. Бел. Выд. Т-ва. Вільня, 1922 г. Стр. 57 Цана 0,75

Гурскі.—Наглядны арытмэтычны задачнік. Першы год вучэньня. Вільня, 1926 г. Стр. 39, Цана 0,60

Д.

Дамарослы Я. — Аматарскі зборнік лірычных твораў, сялянак, поэмаў, гумарыстыкі і элегій.. Выд. Харытановіча, Вільня, 1929 г. Стр. 32. Цана 0,65

Дзяргач. — Тыпы Палесься. Абразкі і легенды. Адбітак з газэты „Грамадзкі Голас" Вільня, 1924 г. стр. 130. Ц. 1,00

Дыямэнты. Беларускае Выдавецтва „Зорка". Кіеў, 1919 г. Зборнік лепшых твораў многіх беларускіх поэмаў і пісьменьнікаў. Стр. 84. Цана . . . 2,50

Дыфоў Д. — Робінзон Крузо. Пераклаў Я. Ст. Выд. Я. Ст. Вільня, 1929 г. Дужа цікавыя і прыгожыя апавяданьні. Кніжка ўсесьветнай славы. Пераклад, нажаль, агулам няўдалы. Стр. 69. Цана 1,75

Додэ А. — Сэкрэт Дзядзькі Карніля і іншыя француcкія творы ў перакладах. Выд. Т-ва „Пагоня." Вільня, 1927 г. Апавяданьні. Стр. 56. Цана 0,30

Дубоўка У. — Строма. Вершы. Выд. „Нашай Будучыны." Вільня, 1923 г. Стр. 28. Цана 0,80

Дуж-Душэўскі К. і В. Ластоўскі — Слоўнік Геомэтрычных і Трыганамэтрычных тэрмінаў і сказаў. (Расейска-бел. і беларуска-расейскі). Выд. Мін. Бел. Спраў у Літве. Коўна 1923 г. Дужа карысны для беларускіх вучняў і студэнтаў. Стр. 128. Цана . . . 2,00

(д. б.)

Танная продажа беларускіх кніг.

БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ «ПАГОНЯ»

(Вільня, Людвісарская № 1)

прадаўжае танную продажу беларускіх кніг, якіх сьпіс кнігарня высылае, хто прышле на гэта марку на 10 гр.

Кнігарня на кожнай з празначаных для таннай продажы кніг робе значную ўступку, а на некаторых уступае палавіну (50 проц.) Танная продажа ўжо пачалася і будзе трываць да 20. II. 1930 г. Грамадзяне, пасьпяшыце скарыстаць з гэтай рэдкай аказіі.

Увага: Кніжкі высылаюцца поштай па атрыманьні ўсей вартасьці заказу, або накладной платай (za pobraniem) па атрыманьні аднэй трэцяй часткі вартасьці заказу.

Рыгору Волку Грошы атрымалі — дзякуем. Календар вышле Вам кнігарня „Пагоня."

Ал. Шышкоўскаку. Грошы атрымалі, дзякуем, газэту пасылаем.

Я. Сыз. 3 зл. атрымалі — дзякуем.

Ст. Кукуцю. Пісьмо атрымалі, прынялі да ведама

М. Дурэйку. Вашу просьбу перадалі ў кнігарню „Пагоня", мы думаем, што кніжкі зьменяць. Войтку спыняем высылку газэты.

П. Жылевічу. Газэту пасылаем, прысылайце падпісную плату.

Алес. Халявіку. Газету пасылаем, прысылайце грошы на газэту.

Ант Луцкевічу. Карэспанденцыю зьмесьцім, пішыце больш. Адрэс перадалі ў Рэд. „Шляху Моладзі."

Я. Вішнеўскаму. Газэту пасылаем, не забывайце аб падпісной плаце.

Ко-ко. Вершы будзем зьмяшчаць, старайцеся больш іх паліраваць, пішыце.

Ів. Урбановічу. Газэту будзем пасылаць. Кніжкі Вы можаце выпісаць з кнігарні „Пагоня" З матэр'ялаў аб пісару скарыстаем.

Алекс. Кірэню. „Бел. Крыніца" выходзіць два разы ў месяц лацінкай, і два кірыліцай (рускія літары).

Ал. Казлу. Грошы атрымалі, дзякуем.

Міх. Бунару. Падпісную плату на паўгодзьдзя атрымалі, дзякуем.

Він. Кірэю. Падпіску атрымалі, газэту пасылаем.

Мужычку. Карэспандэнцыі зьмесьцім, пішыце больш.

Макаўлянцу. З карэспандэнцыяў скарыстаем, вершы да друку не падходзяць. Пішыце лепш карэспандэнцыі.

„Беларускаю Крыніцу" пасылаем:

Я. Ліпінскаму, Ф. Дарашевічу, Ст. Садрэйку. бібліятэцы - чытальні у в. Доўгі-Лог.

Я. Каляд зе. Газэту пасылаем Вам акуратна, дамагайцеся на пошце.

В. Чарн. З карэспандэнцыі скарыстаем.

Рэдактар Янка Шазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч